# СТРАТЭГІІ РЭМІФАЛАГІЗАЦЫІ Ў РАМАНЕ Л. РУБЛЕЎСКАЙ «ЗАБІЦЬ НЯГОДНІКА, АЛЬБО ГУЛЬНЯ Ў АЛЬБАРУТЭНІЮ»

**Ю. А. Афанасьева**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*5902053@mail.ru;*
*навук. кір. – Г. М. Бутырчык, канд. філал. навук, дац.*

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца выяўленне стратэгій рэміфалагізацыі ў рамане Л. Рублеўскай «Забіць нягодніка, альбо гульня ў Альбарутэнію» (2012). У выніку даследавання даказана, што працэс рэміфалагізацыі ў творы адлюстроўваецца ў выбары гульнявога фармату рамана (наяўнасць трох светаў, у якіх адбываецца ўзаемадзеянне герояў, цыклічнага часу і прасторы, фантастычных падарожжаў у часе, выкарыстанне постмадэрнісцкага інструментара, які адзначае шматвектарнасць развіцця беларускай нацыі), наданні традыцыйнай сімволікі іншага значэння (груша і абраз як сувязь паміж мінулым і сучасным, узаемадзеянне пакаленняў), стварэнні персанажаў у развіцці, паступовай змене іх ўспрымання (вобразы пяці галоўных герояў, В. Саковіча), выкарыстанні аповеду ад першай асобы. Закранаюцца актуальныя для нацыянальнага дыскурсу праблемы гістарычнай праўды, карыстання беларускай мовай, пераемнасці пакаленняў і ролі асобы ў гісторыі. Асэнсаванне беларускай нацыі ў якасці ўяўнай супольнасці дазваляе ў гульнявым фармаце мастацкага твора вызначыць працэс яе стварэння, завастрыць увагу на пэўных момантах нацыянальнай гісторыі і перадаць веды будучым беларусам.

***Ключавыя словы*** : рэміфалагізацыя; нацыягенез; канструкт; гульня; памяць.

Рэміфалагізацыя як сацыякультурны феномен характарызуе сучаснае грамадства, занятае глабальным пераглядам каштоўнасцяў у эпоху інфармацыйнага панавання. Крызіс пазнання, які суправаджаецца адчуваннямі няўстойлівасці індывідуальнага быцця і ўяўнасці грамадскай бяспекі, спараджае цікавасць да цыклічных тэорый міфа і, як следства, жаданне прымяніць знаёмыя метады аналізу да навакольнай рэчаіснасці. Рэміфалагізацыя дапамагае ўсвядоміць базавую ролю міфа ў структураванні чалавечага вопыту як сродку цэласнага, інтуітыўнага, комплекснага разумення свету. Як адзначае вядомы савецкі філолаг і гісторык культуры Е. М. Меляцінскі, феномен рэміфалагізацыі, які цыклічна выяўляецца ў сусветнай культуры, выклікае наступныя зрухі ў разуменні міфа: 1) прызнанне яго вечна жывым пачаткам; 2) вылучэнне ў ім сувязі з рытуалам і канцэпцыяй вечнага паўтарэння; 3) максімальнае збліжэнне ці нават атаясненне міфа і рытуалу з ідэалогіяй і псіхалогіяй, а таксама з мастацтвам [5, с. 28].

Рэміфалагізацыя як сучасная сусветная тэндэнцыя асэнсавання міфа ва ўсіх сферах чалавечага жыцця ўяўляецца асабліва актуальнай у кантэксце (рэ)фарміравання беларускай нацыі. Канцэпцыя «ўяўных супольнасцяў», створаная брытанскім сацыёлагам і палітолагам Б. Андэрсанам у 1983 г., не губляе сваёй актуальнасці і сёння – нацыі вызначаюцца ў якасці палітычных

канструктаў, абмежаваных і суверэнных, якія свядома ствараюцца людзьмі, якія па сваёй думцы належаць да адной нацыі, віртуальнай супольнасці [7]. З даследчыкам згаджаецца і беларускі філосаф В. Акудовіч : «Нацыя – гэта нішто іншае, як міф пра Нацыю» [2, с. 53]. Нацыя вызначаецца як культурны артэфакт, універсалія, якая суправаджае быццё таго ці іншага народа. Беларускі міф на працягу доўгіх гадоў фармуецца знешнімі сіламі ва ўгоду чужых захопніцкіх амбіцый і ідэалогіі; ён напоўнены стэрэатыпамі і белымі плямамі зрэпрэсаванай генетычным страхам калектыўнай памяці. Рэміфалагізацыя можа быць разгледжана як стратэгія ў пошуку вытокаў беларускай нацыі, пераадоленне фрагментацыі яе светапогляду і самаідэнтыфікацыі, бо, па словах даследчыцы А. С. Міхалеўскай, «масавая рэміфалагізіраванасць практычна ўсіх структур сучаснага грамадства з'яўляецца следствам нерэалізаванай патрэбы асобы ў цэласнай карціне свету» [6, с. 20] (тут і далей пераклад з рус. мой. – *Ю. А.*). Рэміфалагізацыя спрыяе аднаўленню нацыянальнага культурнага кода і (рэ)фарміраванню нацыянальнага міфа, павышэнню кошту беларускага культурнага капіталу [8].

Як паказвае кандыдат гістарычных навук А. А. Бікетава , «на працягу 1991–2020 гг. мы назіраем змены ў калектыўнай памяці беларусаў, якія характарызуюцца пераацэнкай асноўных момантаў гісторыі, паступовым "забыццём" савецкага перыяду і выцясненнем яго з калектыўнай памяці, успрыманнем нацыянальнай гісторыі як лакальнай гісторыі ў "еўрапейскім кантэксце"» [4]. Масавая свядомасць, дастаткова міфалагізаваная і падпарадкаваная маніпуляцыі, на сённяшні дзень працягвае перажываць «посткаланіяльны сіндром», таму патрэбна рэканструкцыя міфалогіі. Савецкі міф карыстаецца многімі міфалагемамі (роля партызанскай Беларусі ў перамозе над нацызмам, братэрства ўсіх з усімі, адна народнасць, якая насамрэч вызначаецца як дамінантная руская, і інш.), аднак многія факты рэчаіснасці, пераасэнсаваныя ў рамках архетыпічнага мыслення, глыбока схаваныя ў калектыўным падсвядомым, што ўплывае на сучасную нэаміфалагічную свядомасць беларусаў. З дапамогай творчасці міф пачынае дзейнічаць як ахоўны механізм, які перашкаджае распаду соцыуму ва ўмовах інфармацыйнай перагружанасці «глабальнай вёскі», надае цэласнасць нацыянальнай супольнасці.

Рэміфалагізацыя нацыянальнай гісторыі і яе складнікаў у рамане беларускай пісьменніцы Л. Рублеўскай «Забіць нягодніка, альбо гульня ў Альбарутэнію» (2012) адбываецца ў рамках постмадэрнісцкага наратыву рамана-інструкцыі. Неагістарычная проза, якая спрыяе выкарыстанню новых пунктаў гледжання для аналізу гістарычнага наратыву і фарміраванню больш шматграннага нацыянальнага міфа, дазваляе творча пераўтварыць мінулае ў свядомасці сучаснага чытача. Нацыянальнаму патрэбна гістарычнае, бо яно рэалізуе ўяўную супольнасць у паўсядзённым жыцці. Як пазначае В. Акудовіч : «Само гістарычнае не ёсць падставай

(прынамсі, непасрэднай) нацыянальнага, але праз упісанасць гістарычнага ў “астральную” фігуру нацыі, апошняя набывае цялеснасць у прасторы і часе, а з гэтага і легітымацыю ў ментальным дыскурсе» [2, с. 10–11]. Злучаючы ў творы масавае і элітарнае, Л. Рублеўская дае чытачу мноства альтэрнатыўных канцовак і аўтарскую рэфлексію з нагоды гістарычных падзей і іх вынікаў у папулярным фармаце інтэрнэт-рамана. Кожныя часткі – «Удзельнік…» (5), «Абсталяванне для гульні», «Гульня» (6), «Па-за гульнёй» (8), «Фінальная гульня» (2), «Эпілог» (5) – складаюцца з некалькіх варыянтаў ці фрагментаў, якія ствараюць адпаведную паліфанію галасоў калектыўнага беларускага досведу.

Зменлівая Беларусь-Альбарутэнія (лац. Albaruthenia), асацыятыўна звязаная з Вандэяй А. Адамовіча і беларускай Касталіяй В. Акудовіча – гэта кіраўніцтва да выкарыстання, гульня, заяўленая ў назве рамана. Істотнасць ўжывання канцэпта да тлумачэння працэсу нацыягенезу вызначае неабходнасць разумення правілаў і мэты дадзеннага дзеяння : «Так, гульня не надзяляе цябе ніякімі правамі, але яна і не патрабуе ад цябе ніякіх абавязкаў, апрача абавязку прытрымлівацца правілаў гульні. Яна нічога табе не абяцае, акрамя магчымасці гуляць у тую гульню, якая табе падабаецца, бо праз яе ты можаш кампенсаваць тое, чаго пазбаўлены ў рэальным жыцці» [2, с. 157]. Гістарычная дакладнасць, новыя факты, пошук правільнага рашэння і высвятленне механізмаў палітычнай гульні іншых народаў, якія ствараюць свае нацыі, – тое, чаго не хапае сучаснаму беларусу. Сучасная гісторыя беларускай нацыі пачатку XXI ст., напоўненая міфамі масавага спажывання, сплятаецца з гісторыяй выжывання беларушчыны падчас рэпрэсій 1920-х – 1930-х гг., задакументаванай іншымі «гульцамі» ў выгодным ім святле. Падарожжы ў часе выкарыстоўваюцца Л. Рублеўскай для спробы пошуку вытокаў, каранёў сучаснага жыцця, таму што нацыянальную культуру трэба адваёўваць у самога Часу [2, с. 145]. Правядзенне пастаяннай паралелі паміж сучаснасцю і тым перыядам, які лічыцца пунктам адліку беларускай дзяржаўнасці, з'яўляецца спосабам парадкавання следча-прычынных сувязяў у гістарычным наратыве, спробай надаць нацыі форму і значэнне. З дапамогай уяўлення ў Альбарутэніі змяняецца ўспрыманне часу і прасторы (цыклічнасць змены мінулага і цяперашняга часу, сувязь «пазачасавых» лакацый і гістарычных падзей), адчуваецца рэальная рухомасць мяжы паміж жыццём і смерцю, фактамі з рэчаіснасці і сфабрыкаванымі дакументамі, сапраўдным патрыятызмам і здрадай.

Удзельнікаў гульні, сапраўдных *homo ludens* беларускай нацыі, усяго пяць : Дар’я / Даліла, Генусь / Тэрмінатар, Макс, Эдзік / Едрусь, Руслана Палынская. Кожны герой прыходзіць да Альбарутэніі пэўным чынам : Даліла пачынае цікавіцца гісторыяй свайго роду, часта разглядаючы могілкі каля месца працы, Генусь праз заечую губу замыкаецца ў сабе і цікавіцца віртуальнай прасторай, дзе і знаходзіць віртуальную супольнасць, Макс

сустракае яе ў кнігах і на сайце Генуся, Едрусь знаёміцца з ёй праз свае песні і Далілу, а Руслана «проста нарадзілася ў абдоймах Альбарутэніі» [3], хоць і прыходзіць у гульню праз Едруся і не адразу прымае ўдзел у падарожжах ў часе. Пералічаныя героі ўяўляюць сабой напалову міфалагічныя сутнасці : Даліла, падобная да кобры, асацыюе сябе з Плачкай Я. Баршчэўскага, Генусь з-за сваёй дзіцячай хваробы параўноўваецца з ваўкалакам, пра якога спявае Едрусь у сваім рок-гуртку і якіх малюе Руслана, чый першы ўспамін – Купальскія вогнішча, на вокладцы іх дыска. Аўтсайдэры па сваёй сутнасці, якія маюць нешта аднолькавае ў сэрцы (прыхільнасць да роднае мовы), таму выступаюць як аснова Нацыі. Альбарутэнія існуе не толькі ў сучаснасці, але і ў мінулым, звязвае лёсы пяці маладых людзей і прадстаўнікоў старэйшых пакаленняў – Разаліі Іванаўны, Валяр’яна Скаловіча і др. Знікненне герояў у Альбарутэніі, іх трыксцерскія пераходы ў рамках фэнтэзійнага двусвеցця можна апісаць і як «код адсутнасці» беларусаў, ажыццяўлены на практыцы, і як своеасаблівае паломніцтва, вызначанае ў якасці асновы нацыянальнага будаўніцтва Б. Андэрсанам. Займаючыся даследаваннем мінулага, аналізам цяжкіх сітуацый выбару, у якіх аказваецца беларуская інтэлектуальная эліта пачатку XX ст., малодшае пакаленне паступова праходзіць працэс рэміфалагізацыі. Гэтаму спрыяе, па-першае, той факт, што героі часта наведваюць месцы памяці (могілкі, каля якіх знаходзіцца партал у Альбарутэнію), удакладняючы забытае нацыяй, цікавяцца падзеямі мінулага, пра якія распавядае старая гаспадыня дому, дзе гульня пачынаецца ўпершыню, і, па-другое, асоба В. Скаловіча, знаёмства з якім паступова трансфармуе пачуцці абыякавасці да Радзімы, непрыязнасць да некаторых фактаў яе гісторыі ў любоў (дынаміка адносін феміністкі-амазонкі Далілы і выкладчыка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта В. Скаловіча).

Траўмы пасля кожнага падарожжа ў Альбарутэнію рэальныя – спробы змяніць калектыўнае мінулае нацыі ўплываюць не толькі на ментальнае адчуванне сябе, але і на здароўе: «І плата за знаходжанне Там была высокая. Як за знаходжанне ў любым чужародным асяродку – у вадзе, агні, на лютым марозе ці страшэннай вышыні. Стан трохі падобны на ліхаманку пры высокай тэмпературы… Хвіліны забіралі гады» [3]. Посткаланіяльны сіндром, які ўсё яшчэ перажываецца сучасным беларусам, фрагментаваная і палітызаваная культурная памяць, экзістэнцыяльнасць існавання на мяжы паміж Захадам і Усходам, спробы пабудовы «еўрапейскай ідэнтычнасці» на постсавецкай прасторы – траўма, якую неабходна лячыць. Наўмысная гераізацыя некаторых беларусаў або іх ачарненне выцясняе ментальную траўму на другі план, але ніколі назаўжды – як болі ў сэрцы, якія атрымлівае Генусь напрыканцы рамана, нагадваюць аб сабе і шнары мінулага ў жыцці многіх, хто належыць памежнай нацыі.

На ўзроўні сімволікі можна казаць аб пэўнай ступені рэміфалагізацыі вобраза грушы, цесна звязанага з ідэяй беларускага нацыягенезу. Пладовае дрэва, якое асацыюецца з радзімай у рамане Ў. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» (1965) і деканструюецца ў постмадэрнісцкім рамане С. Балахонава «Імя грушы» (2005), які ў сваю чаргу адсылае да рамана аб сімулякрах «Імя ружы» (1980) У. Эка, у творы Л. Рублеўскай звязвае мінулае і сучаснасць, дае пачатак вандраванняў у часе. Галіна дзедаўскай грушы, з-за якой пачаліся крывавыя падзеі ў адной з беларускіх сем’яў, – тое, што жадае забраць з Альбарутэніі Разалія Іванаўна, якая «ўпарта спрабавала выправіць лёс свайго роду, скручаны, як жалезны крыж, у які ўдарыла маланка» [3]. Пошук грушы старая жанчына перадае Даліле, але іранічнае стаўленне моладзі да «палітычна няправільнага» дрэва пераходзіць у раскрыццё абставінаў смерці беларускай інтэлектуальнай эліты пачатку XX ст. і спробу выратаваць чалавека, звязанага з рэпрэсіўным механізмам. Вяртанне доктара Скаловіча назад у свой час сведчыць аб тым, што рэфармаванне сучаснасці павінна праходзіць разам з усведамленнем і прыняццем мінулага.

Рэміфалагізацыя асобы В. Скаловіча, адной са шматлікіх ахвяр катаў, адбываецца паступова і агаляе прыём канструявання ролі асобы ў гісторыі : у свой час мужчыну выкарыстоўваюць у якасці прынады для выцягвання палітычна небяспечных прызнанняў звязаных з ім «непажаданых элементаў». У сувязі з гэтым згадваюцца жахлівыя смерці беларускіх прадстаўнікоў эліты і сумна вядомая Ноч расстраляных паэтаў. Для прадстаўнікоў улады герой паўстае ў якасці здрадніка – падобная сітуацыя паўтараецца ў свеце маладых герояў. Даліла па-рознаму абвінавачвае чалавека, якому толькі падчас допытаў даюць нармальную вопратку, што затуляе шнары на целе, і якога непрыкметна прывязваюць да крэсла. Двухаблічнасць героя з вострым розумам нагадвае архетыпічную постаць трыксцера (дзяцінства ў цырку і вандроўны лад жыцця; выклікае нянавісць і катаў, і былых сяброў, застаецца заўсёды на памежжы, паміж трох светаў Альбарутэніі, свайго часу і часу апошняй групы гульцоў), тады як смерць героя ў мінулым і яго «адраджэнне» ў сучаснасці звязана з міфам, у якім бог памірае і ўваскрасае. Сын Дalілы, Валерка, – ён носіць сучасны варыянт імя яго бацькі, Валяр’яна – увасабляе сапраўднае дзіця нацыянальнай гісторыі, біялагічны саюз мінулага і сучаснасці, стратэгію выжывання сучаснага беларуса. Такім чынам у рамане разглядаецца спроба ўкаранення новага пакалення беларусаў у гісторыю, актуалізацыя формы перадачы культурнага капіталу па спадчыне.

Адносна хуткая акліматызацыя В. Скаловіча да сучасных умоў жыцця ў Беларусі паказвае на падобны стан сацыякультурных працэсаў мінулага і сучаснасці. Іх ўзаемаўплыў і змешванне ў працэсе рэміфалагізацыі звяртае ўвагу на ролю мовы ў фарміраванні ўяўнай супольнасці Беларусі. Мова як спосаб уяўлення, звяно, якое аб’ядноўвае індывідуальных носьбітаў

пэўнага светапогляду ў калектыў, прадугледжвае сумеснае яе выкарыстанне ва ўсіх сферах, у якіх задзейнічана нацыя, у тым ліку і ў дыскурсе ўлады : «Сказана – хочаш даведацца, чыя ў краіне ўлада, паслухай, на якой мове вучаць дзяцей у школе» [3]. Важнасць адукацыі на роднай мове для канструявання беларускай нацыі і яе рэальнае ігнараванне ў процівагу рускай мове ўвасабляе прыклад з Русланай і яшчэ некалькімі вучнямі, якія жадаюць вучыцца цалкам на беларускай, але не маюць мажлівасці. Стаўленне беларусаў да ўласнай мовы як да знаку бяды становіцца перашкодай для кансалідацыі грамадства. Карыстанне «мовай аўтсайдэраў», якое і сёння нагадвае «грамадзянскую акцыю ці мастацкі перформанс» [2, с. 105], у пачатку Гульні з'яўляецца адзіным элементам, які аб'ядноўвае пяцярых удзельнікаў. Такім чынам сцвярджаецца думка пра тое, што быць беларусам, як і карыстацца мовай, – гэта выбар. Істотным здаецца той факт, што сярод герояў ёсць прадстаўнікі гістарычнага (Макс) і філалагічнага факультэтаў БДУ (Руслана), якія карыстаюцца беларускай мовай у межах навуковага і мастацкага гуманітарных дыскурсаў. Акрамя таго, дзяўчына стварае твор-дакумент пра Альбарутэнію, які чытач успрымае як сведчанне, – апавяданне ад першай асобы можа разглядацца як вопыт ініцыяцыі носьбіта міфалагічнага мыслення. Гэта спрыяе пашырэнню кола гульцоў у Альбарутэнію сярод зацікаўленых у мінулым сваёй радзімы і сцвярджае патэнцыял мастацкай літаратуры, якая мае магчымасць сканструяваць цэласнае бачанне нацыянальнага міфа.

Змена міфалагічнага базісу нацыянальнай свядомасці звязана з вызначэннем месца пачуццёвага вопыту ў жыцці асобнага чалавека. Актуалізацыя рэлігіі ў сучасным свеце выступае ў якасці спробы асобным індывідам гарманізацыі залішне рацыянальнага свету інфармацыйных патокаў. У рамане назіраецца важнасць рэлігійнага міфа ў жыццях герояў абодвух светаў. Рэлігійнае пытанне ў 1920-х–1930-х гг. ставіцца вельмі востра – за яго можна паплаціцца жыццём. Так, айцец Мікалай пахаваны жыўцом, разам з абразом, які доктара Скаловіча папрасілі таемна перадаць паміраючаму ў бальніцы. Цяжкае выпрабаванне на могілках не вынішчае веру героя. У часе малодшага пакалення гульцоў ён доўга моліцца на абраз, які захоўваецца ў доме Далілы, – «Маленне аб Чашы» – той жа абрад выконвае Руслана Палынская перад тым, як у апошні раз апынуцца ў Альбарутэніі. Вядомая сцэна, у якой Ісус, прадчуваючы смерць, кажа : «пранясі чару гэтую міма мяне; але не чаго я хачу, а чаго Ты» (Мк. 14 : 36), сімвалічна пазначаючы лёс беларускага народа, які яму не падуладны, з'яўляецца толькі маскай. За плёнкай з малюнкам хаваецца абраз з мінулага доктара – Маці Божая Адзігітрыя, якая паказвае шлях, што суадносіцца са сцвярджэннем вядомага беларускага філосафа І. Абдзіраловіча аб самастойнасці пошуку беларусам сябе : «Трэба шукаць на іншых шляхох» [1]. Абраз, як і вобраз грушы, звязвае мінулае і сучаснасць, увасабляючы

важнасць надзеі на лепшае ў складаных умовах самавызначэння : «Кожны народ мае права ведаць, хто ён ёсць» [3].

Такім чынам, у рамане Л. Рублеўскай «Забіць нягодніка, альбо гульня ў Альбарутэнію» працэс рэміфалагізацыі ў творы адлюстроўваецца ў выбары гульнявога фармату рамана (наяўнасць трох светаў, у якіх адбываецца ўзаемадзеянне герояў, цыклічнага часу і прасторы, фантастычных падарожжаў ў часе, выкарыстанне постмадэрнісцкага інструментара, які сцвярджае шматвектарнасць развіцця беларускай нацыі), наданні традыцыйнай сімволікі іншага значэння (груша і абраз як сувязь паміж мінулым і сучасным, узаемадзеянне пакаленняў), стварэнні персанажаў у развіцці, паступовай змене іх ўспрымання (вобразы пяці галоўных герояў, В. Саковіча), выкарыстанні аповеду ад першай асобы. Закранаюцца актуальныя для нацыянальнага дыскурсу праблемы гістарычнай праўды, карыстання беларускай мовай, пераемнасці пакаленняў і ролі асобы ў гісторыі. Асэнсаванне беларускай нацыі ў якасці ўяўнай супольнасці дазваляе ў гульнявым фармаце мастацкага твора вызначыць працэс яе стварэння, завастрыць увагу на пэўных момантах нацыянальнай гісторыі і перадаць веды будучым беларусам.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам. Даследзіны беларускага светагляду / І. Абдзіраловіч. – Менск : Навука і тэхніка, 1993. – Спосаб доступу : https://knihi.com/Ihnat_Kanceuski/Adviecnym_slacham.html. – Дата доступу : 24.01.2022.
2. *Акудовіч, В. В.* Код адсутнасці (асновы беларускай ментальнасці) / В. В. Акудовіч. – Мн. : Логвінаў, 2007. – 216 с.
3. *Рублеўская, Л.* Сутарэнні Ромула. Раманы / Л. Рублеўская. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – 520 с. – Спосаб доступу : https://kamunikat.org/download.php?item=58832-1.epub&pubref=58832. – Дата доступу : 24.01.2022.
4. *Бикетова, Е. А.* Политика памяти в Беларуси : особенности национального дискурса / Е. А. Бикетова // Дневник Алтайской школы политических исследований № 36. Современная Россия и мир : альтернативы развития (Глобальные исторические события XX века и национальные варианты политики памяти) : сборник научных статей / под ред. Ю.Г. Чернышова. – Барнаул : Изд-во Алт. ун-та, 2020. – С. 49 – 59.
5. *Мелетинский, Е. М.* Поэтика мифа / Е. М. Мелетинский. – М. : Наука, 2000. – 407 с.
6. *Михалевская, А. С.* Миф и наука : проблемы взаимодействия в современном обществе: дис. канд. филос. наук : 09.00.11 / А. С. Михалевская – Иваново, 2015. – 142 с.
7. *Anderson, B.* Imagined Communities : Reflections on the Origin and Spread of Nationalism / B. Anderson. – London, N. Y. : Verso, 2006. – 240 p.
8. *Guillory, J.* Cultural Capital : The Problem of Literary Canon Formation / J. Guillory. – University of Chicago Press, 1995. – 408 p.